ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ЎНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 22 (1058) Чацвер, 20 чэрвеня 1974 г. Цана 2 кап. Газета выходзіць з 1935 г.

## Насустрач 30-годдзю вызвалення Беларусі

**Да слаўнай даты— 30-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў—у бібліятэцы БДУ аформлена тэматычная кніжная выстаўка «Подзвігі герояў у беларускай літаратуры».**

**Тут знаходзяцца шырока вядомыя буйныя творы—«Незабыўныя дні» М. Лынькова, «Франтавыя старонкі» В. Быкава, «Вайна пад стрэхамі» А. Адамовіча, а таксама мемуары былых падпольшчыкаў, партызан.**

* * *

**Для спартыўна-аздараўленчага лагера «Нарач» падрыхтаван стэнд «30-годдзе вызвалення Беларусі». Маляўніча аформлены, з мноствам копій фотаздымкаў часоў вайны, схемамі баявых аперацый, стэнд расказвае аб дзеянні трох Беларускіх і Першага Прыбалтыйскага франтоў. Ён адраджае незабыўныя падзеі вызвалення сталіцы рэспублікі і абласных цэнтраў, змяшчае фотаздымкі выдатных военачальнікаў К. К. Ракасоўскага, І. Х. Баграмяна, Г. Ф. Захарава, І. Д. Чарняхоўскага.**

* * *

**Аддаць даніну памяці савецкім людзям, якія загінулі ад рук фашысцкіх карнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, прыехалі ў Хатынь завочнікі першага курса геаграфічнага факультэта. Ля падножжа Кургана Славы яны ўсклалі кветкі.**

**Экскурсія была арганізавана кафедрай гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў.**

## З БОЛЬШАЙ ЭФЕКТЫЎНАСЦЮ

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

Закончыўся навучальны год у сетцы партыйнай асветы. Арганізавана прайшлі падагульняючыя заняткі ва ўсіх семінарах і гуртках.

Галоўная ўвага парткома ў сёлетнім навучальным годзе была сканцэнтравана на тым, каб забяспечыць глыбокае засваенне камуністамі і ўсімі супрацоўнікамі універсітэта ідэй марксізму-ленінізму, выпрацаваных партыяй поглядаў па асноўных пытаннях сучаснасці, задач унутранай і знешняй палітыкі КПСС і на гэтай аснове дабіцца далейшага павышэння грамадска-палітычнай актыўнасці усяго нашага калектыву па ажыццяўленню рашэнняў XXIV з'езда партыі, заданняў дзевятай пяцігодкі. Першыя заняткі былі прысвечаны вывучэнню матэрыялаў Пленумаў ЦК КПСС, даклада Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева «Аб пяцідзесяцігоддзі Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік».

Паспяховая работа любога семінара вызначаецца двума асноўнымі фактарамі: уменнем кіраўніка арганізаваць работу, яго прапагандысцкім вопытам і адносінамі слухачоў семінара, іх актыўнасцю, зацікаўленасцю.

Многімі семінарамі у нас кіруюць вопытныя таварышы, якія маюць прапагандысцкі стаж, такія, як В. І. Сцяпанаў, В. Р. Заўрыеў, А. В. Дулаў, А. І. Ляўко, У. А. Навіцкі, А. І. Жукаў, В. А. Пыжкоў, І. Г. Родзін і іншыя. Заняткі гэтых семінараў праходзяць жыва, цікава, слухачы актыўна абмяркоўваюць вывучаемыя пытанні. Тон у рабоце семінараў задаюць камуністы.

Добрыя водгукі слухачоў і аб семінарах, якія вялі больш маладыя прапагандысты Е. І. Мішук, Т. І. Адамовіч, М. І. Віннікаў і іншыя.

Праведзеная парткомам у красавіку праверка работы сеткі партыйнай асветы паказала, што ёсць у нас яшчэ шэраг семінараў, дзе заняткі праходзяць фармальна, сумна, без неабходнай актыўнасці слухачоў і кіраўнікоў. Як правіла, і наведванне такіх семінараў невысокае.

Партыйным бюро факультэтаў неабходна яшчэ больш павысіць інтарэс да работы тэарэтычных семінараў, рэгулярна заслухоўваць на сваіх пасяджэннях інфармацыі старастаў і кіраўнікоў аб ходзе заняткаў.

Палітычная вучоба супрацоўнікаў павінна знаходзіцца ў цэнтры ўвагі загадчыкаў кафедр. На пасяджэннях разам з вытворчымі неабходна абмяркоўваць таксама пытанні палітычнай асветы, звярнуць пры гэтым увагу на маладых супрацоўнікаў.

У гэтым месяцы ўсе партыйныя арганізацыі павінны завяршыць фарміраванне сеткі партыйнай асветы на новы навучальны год. Неабходна правесці гэту важную работу арганізавана, уважліва ўлічыць інтарэсы слухачоў, строга прытрымлівацца прынцыпу добраахвотнасці.

Далейшае ўдасканаленне форм і метадаў правядзення заняткаў будзе яшчэ больш садзейнічаць павышэнню якасці гэтай работы, умацуе яе дзейснасць і эфектыўнасць. Нам неабходна імкнуцца да таго, каб атрыманыя слухачамі палітычныя веды былі грунтоўнымі, глыбокімі і знаходзілі прымяненне ў паўсядзённай практычнай дзейнасці.

**В. ШЛЫК,**
**член парткома.**

## «ХАТЫНЬ: БОЛЬ І ГНЕЎ»

Так называлася канферэнцыя чытачоў, арганізаваная саветам бібліятэкі імя Янкі Купалы і рэдакцыяй газеты «Літаратура і мастацтва». У рэспубліканскім Доме мастацтваў сабралася працоўная моладзь, студэнты, вучні старэйшых класаў мінскіх школ. Да чытачоў прыйшлі вядомыя беларускія пісьменнікі і паэты Янка Брыль, Генадзь Бураўкін, Анатоль Вярцінскі, Сяргей Грахоўскі, Максім Танк і іншыя. Былі запрошаны беларускія артысты Валерый Анісенка і Мікалай Казінін.

Сваімі ўражаннямі аб «Хатынскай аповесці» Алеся Адамовіча падзялілася дзесяцікласніца 72-й Мінскай школы Святлана Кароткая. Цікава было паслухаць меркаванні рабочых, служачых, студэнтаў аб творах дакументальнай і мастацкай літаратуры, прысвечаных хатынскай трагедыі.

Герой Савецкага Саюза Іван Мацвеевіч Цімчук расказаў аб тым, што ўбачыў ён, калі разам з байцамі партызанскага атрада прыйшоў на папялішча Хатыні.

Выступалі перад прысутнымі скульптар Хатынскага мемарыяла, лаўрэат Ленінскай прэміі С. І. Селіханаў і іншыя.

Новая песня Ігара Лучанка да кінафільма «Ветэраны» прагучала на канферэнцыі ў выкананні аўтара і артыста В. Анісенкі.

У заключэнне быў паказан дакументальны фільм аб Хатыні.

**Л. НОВІКАЎ,**
**студэнт.**

Народны кантроль

## УЛІЧЫЎШЫ ВОПЫТ

Падводзячы вынікі работы штабаў «Камсамольскага пражэктара» факультэтаў і універсітэта ў сёлетнім навучальным годзе, трэба сказаць, што яны былі створаны і працавалі згодна з палажэннем аб «Камсамольскім пражэктары». Выключэнне складае юрфак, дзе на справаздачна - выбарным камсамольскім сходзе не быў выбран штаб «КП» і на працягу месяца сакратар камітэта камсамола М. Корзун не мог паправіць гэты пралік. Арганізацыйная неразбярыха тут прывяла да таго, што прыкладна на працягу двух месяцаў ніякай работы «пражэктарысты» на факультэце не вялі.

З мэтай азнаямлення актыву «пражэктарыстаў» з палажэннем, галоўнымі задачамі, асноўнымі формамі і метадамі работы штаб «КП» універсітэта тройчы правёў вучобу. Гэта, несумненна, дапамагло правільна арганізаваць работу. І тут нельга не адзначыць незразумелых, калі не сказаць абыякавых адносін старшынь штабаў «Камсамольскага пражэктара» некаторых факультэтаў да гэтых мерапрыемстваў. І ў прыватнасці фізфака, ФПМ. Іх прадстаўнікі ні разу не прысутнічалі на вучобе актыву.

Поспех работы штабаў «КП» у многім залежыць ад аператыўнага асвятлення дзейнасці «пражэктарыстаў», шырокай галоснасці вынікаў работы. На кожным факультэце штаб «Камсамольскага пражэктара» мае свой орган насценнага друку, у выпусках якога асвятляюцца вынікі розных форм грамадскага кантролю: праверак, рэйдаў, аглядаў, рэвізій і г. д. Найбольш злабадзённым пытанням прысвячаюцца выпускі «маланак», «баявых лістоў», «інфармацыйных бюлетэняў».

На жаль, часам выпускамі «КП» займаюцца толькі старшыні штабаў. Такое становішча склалася, напрыклад, на факультэце журналістыкі. І яго нельга апраўдаць, бо ўмова паспяховай дзейнасці «Камсамольскага пражэктара», перш за ўсё,—прыцягненне да ўдзелу ў грамадскім кантролі шырокіх мас моладзі.

Неабходна звярнуць увагу штабаў «КП» на больш цесную сувязь з дзейнасцю груп народнага кантролю, партыйных і прафсаюзных арганізацый факультэтаў, на больш аператыўнае асвятленне актуальных і злабадзённых пытанняў студэнцкага жыцця.

Штабу «КП» універсітэта і факультэцкім штабам давядзецца яшчэ многае зрабіць, каб «Камсамольскі пражэктар» стаў баявым, актыўным памочнікам партыйных арганізацый у барацьбе з рознымі недахопамі, праяўленнямі безгаспадарчасці, у барацьбе за паляпшэнне ўмоў працы, вучобы, быту і адпачынку моладзі.

**П. БРЫГАДЗІН,**
**старшыня штаба «КП» універсітэта.**



Старажытнаславянская мова — даволі складаная. Авалодаеш ёю не адразу. Аб гэтым не раз папярэджваў на лекцыях доктар філалагічных навук А. Я. Супрун.

Студэнтка аддзялення рускай мовы і літаратуры філфака Людміла Мелехава рыхтавалася да экзамена, як заўсёды, добрасумленна. І вось настаў самы адказны момант.

Фота **Д. Чаховіча.**

## ЗАРУБЕЖНЫЯ КАНТАКТЫ

З мэтай пашырэння і умацавання супрацоўніцтва з вну і навуковымі установамі БДУ штогод камандзіруе за мяжу навуковых супрацоўнікаў і студэнтаў. У мінулым годзе, напрыклад, у такіх камандзіроўках пабывала 204 чалавекі.

БДУ мае дагаворы з Іенскім (ГДР), Сафійскім (НРБ), Люблянскім (СФРЮ) і Ягелонскім (ПНР) універсітэтамі. Акрамя таго, падтрымліваюцца пастаянныя кантакты і вядзецца абмен вучонымі і студэнтамі з Карлавым універсітэтам у Празе, універсітэтам у Галле (ГДР) і Шлёнскім універсітэтам у Катовіцах (ПНР).

Навуковыя супрацоўнікі выязджалі ў сацыялістычныя, капіталістычныя, развіваючыяся краіны.

Большасць паездак спецыялістаў звязана з выкладчыцкай працай за мяжой, чытаннем лекцый, перадачай перадавога навуковага вопыту, прапагандай дасягненняў БССР, усяго савецкага народа ў галінах навуковага, эканамічнага, сацыяльнага і культурнага жыцця.

Карыснай была стажыроўка кандыдата тэхнічных навук Г. К. Афанасьева ў Нідэрландах на факультэце прыкладной фізікі Дэльфтскага тэхналагічнага універсітэта. У Іенскім універсітэце знаходзілася група вучоных кафедры новай і навейшай гісторыі БДУ. У адпаведнасці з праграмай прафесар Л. М. Шнеерсон, дацэнты Д. С. Клімоўскі, М. Г. Елісееў удзельнічалі ў навуковай канферэнцыі, прысвечанай задачам даследавання гісторыі міжнароднага рабочага руху ў святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС і VIII з'езда САПГ. Тут з дакладам выступіў прафесар Л. М. Шнеерсон.

Быў таксама абмеркаван змест сумеснага зборніка, які рыхтуецца да выдання кафедрай і секцыяй гісторыі Іенскага універсітэта. Перад студэнтамі секцыі з дакладамі аб Беларусі і яе дасягненнях у галіне народнай гаспадаркі выступілі Д. С. Клімоўскі і М. Г. Елісееў.

У навуковай камандзіроўцы ў Сафійскім універсітэце быў дацэнт кафедры паўправаднікоў Д. С. Даманеўскі, у Іенскім універсітэце — загадчык кафедры фізікі цвёрдага цела дацэнт Г. А. Гуманскі. У Францыі стажыраваўся ў інстытуце палітычных навук Парыжа дацэнт кафедры гісторыі дзяржавы і права В. П. Сярэбранікаў, а старшы выкладчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі Л. С. Дудзінскі быў на стажыроўцы ва універсітэце імя Гумбальта ў Берліне. Усяго выязджала за мяжу 47 навуковых работнікаў.

У сваю чаргу у нашым універсітэце пабывала 234 замежных гасцей: дэлегацыі з Сафійскага, Ягелонскага універсітэтаў, з Рэспублікі Куба, Індыі і Бірмы, Японіі, Аўстрыі, Францыі, ФРГ, Непала.

Прыязджалі студэнты на азнаямленча - вытворчую практыку і ў саставе будатрадаў.

У адпаведнасці з пагадненнем аб сумесным правядзенні навуковых даследаванняў паміж фізфакам БДУ і секцыяй фізікі Іенскага універсітэта ў Мінску знаходзілася супрацоўнік аддзела нелінейнай оптыкі доктар С. Рэнч. Яна была азнаёмлена з пастаноўкай вучэбнай работы на факультэце, а таксама з навуковай работай на кафедрах агульнай фізікі, фізічнай оптыкі і спектральнага аналізу.

На хімічным факультэце на працягу двух тыдняў прафесар Іенскага універсітэта доктар Петцольд знаёміўся з метадамі арганічных комплексных злучэнняў.

Амаль месяц госцем гісторыкаў быў прафесар з Іены Д. Фрыке. Ён прачытаў студэнтам спецкурс «Рабочы рух у Германіі ў канцы XIX—пачатку XX стагоддзяў», а таксама выступіў з лекцыямі аб праблемах студэнцкай моладзі ў ФРГ.

У адпаведнасці з рабочай праграмай у БДУ знаходзіўся і дацэнт секцыі марксізму-ленінізму Іенскага універсітэта Г. Шцір.

Прарэктар Іенскага універсітэта доктар Л. Эльм дэталёва азнаёміўся з работай кафедры навуковага камунізму, марксісцка-ленінскай філасофіі, гісторыі філасофіі і логікі, гісторыі КПСС.

У выніку сустрэч і гутарак з кіраўніцтвам БДУ было вызначана кола мерапрыемстваў, накіраваных на далейшае развіццё супрацоўніцтва абодвух універсітэтаў.

Такія ж плённыя сувязі з замежнымі калегамі паладзілі вучоныя фізічнага і геаграфічнага факультэтаў БДУ.

У 1974 годзе для праходжання вытворча-азнаямленчай практыкі выедуць за мяжу восем студэнцкіх груп. Больш глыбокімі стануць і навуковыя кантакты.

**І. ЧЭПА,**
**прарэктар па рабоце з замежнымі навучэнцамі.**

# ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫ СТАРТ УЗЯЛІ ЗАВОЧНІКІ

НА КАФЕДРЫ фізічнай геаграфіі замежных краін у гэтым годзе абараняла дыпломныя работы 19 студэнтаў стацыянара, вячэрняга і завочнага навучання.

Перш за ўсё належыць адзначыць высокі навуковы ўзровень, выдатнае і добрае афармленне дыпломных работ, што характэрна як для выпускнікоў стацыянара, так і вячэрняга аддзялення і завочнага факультэта. Акрамя таго, сёлета, як ніколі раней, вырасла колькасць дыпломных работ,

## ШТО ПАКАЗАЛА АБАРОНА

якія поўнасцю адпавядаюць профілю кафедры. Сярод іх ёсць і выкананыя на аснове асабістых назіранняў. Так, у рабоце студэнткі-завочніцы Л. А. Аляксандравай «Баксітавыя месцанараджэнні Венгрыі» на аснове літаратурных крыніц, фондавых матэрыялаў і ўласных назіранняў дадзен падрабязны аналіз асноўных баксітавых месцанараджэнняў. Гэта работа атрымала выдатную адзнаку.

Шэраг работ быў выканан па літаратурных крыніцах. Сярод іх варта адзначыць дыпломную студэнта вячэрняга аддзялення М. М. Станкевіча «Нацыянальныя паркі і запаведнікі Паўночнай Амерыкі». Гэта цудоўна аформленая работа таксама заслужыла выдатную адзнаку, была рэкамендавана на агляд і ў якасці вучэбнага дапаможніка.

Студэнтка-завочніца Н. Я. Шурхай абараніла дыпломную работу на тэму «Засушлівы Паўночны Усход Бразіліі». Паўночны Усход Бразіліі (інакш называюць Сертанай або Палігонам засухі)—унікальная тэрыторыя, якая атрымлівае ў год да 1000 мм ападкаў і ў той жа час з'яўляецца адным з найбольш засушлівых раёнаў зямнога шара. Тэма гэта слаба асветлена ў літаратуры, а таму прадстаўляе асаблівы геаграфічны інтарэс. Адзнака — «выдатна».

Вялікую цікавасць выклікала работа студэнткі вячэрняга аддзялення Н. Ф. Малашанкі, выкананая на факультэце ўпершыню. У ёй дадзена падрабязнае асвятленне геаграфічнай літаратуры па БССР, якая з'явілася ў 1955—73 гг. як у саюзным, так і ў замежным друку. Магчыма, гэтай рабоце не хапае крытычнага аналізу, але ў арыгінальнасці ёй адмовіць нельга, як нельга адмовіць і яе неабходнасць. Адзнака таксама выдатная.

На кафедры выкананы і іншыя работы, прысвечаныя розным пытанням і праблемам геаграфіі Беларускай ССР, напрыклад, ахове прыроды і рацыянальнаму выкарыстанню рэсурсаў, у тым ліку лясных у Палессі, меліярацыі басейна ракі Заходні Буг, мікракліматычным даследаванням на мінеральных глебах Палесся і інш. Пералічаныя работы былі выкананы на дастаткова высокім узроўні, а іх абарона была вельмі высока ацэнена.

На жаль, меліся і некаторыя недахопы, у асноўным яны адносяцца да афармлення работ. Мала спасылак на выкарыстаную літаратуру, нярэдка з пагрэшнасцямі аформлен даведачны матэрыял, сустракаюцца картаграфічныя, стылістычныя і іншыя дробныя, на першы погляд, недахопы, якія, аднак, зніжаюць якасць работы. Несумненна, палепшылася мова, але ў адносінах пісьменнасці не ўсё было гладка.

Рэзюмуючы першыя ўражанні ад абароны дыпломных работ, трэба адзначыць значны крок наперад студэнтаў вячэрняга і завочнага навучання, якія не толькі даганяюць студэнтаў стацыянара, але ў шэрагу выпадкаў апярэджваюць іх.

**В. ЗАЎРЫЕЎ,**
**загадчык кафедры фізічнай геаграфіі замежных краін.**

# САМЫ ЗВЫЧАЙНЫ ЭКЗАМЕН

— Калі ласка, я вас слухаю.

— Характэрныя асаблівасці цыкла развіцця пакрытанасенных...

Мы на экзамене. Курс «Вышэйшыя расліны» ў завочнікаў-біёлагаў прымаюць старшы выкладчык Г. І. Зубкевіч і асістэнт А. Я. Яфрэмкіна.

Расчырванелая ад хвалявання дзяўчына адказвае на пытанні хутка.

— Пералічыце прадстаўнікоў сям'і крыжакветкавых.

— Капуста, рэдзька пасяўная, гарчыца...

Недзе ў глыбіні аўдыторыі схілілася над білетам А. Карніловіч. Я ведаю, што гэта прывабная дзяўчына ў залацістых акулярах працуе фельчарам. Спакойныя рукі, вочы глядзяць удумліва — у білеце, відаць, для яе няма незнаёмых пытанняў.

Тым часам выкладчык запаўняе залікоўку Т. Місюкевіч, той самай студэнткі, чый адказ мы ўжо чулі. «Добра»! Уздыхнуўшы з палёгкай, яна выбягае ў калідор.

За дзвярыма ўсё яшчэ гартаюцца падручнікі, у паўпустым корпусе гулкім рэхам аддаюцца тэрміны «спарафіт», «спарафіл», «спарангій». Раптам нехта з другакурснікаў успамінае:

— А півоні, што ў экзаменатараў на століку стаяць, як размнажаюцца?

Гучыць прыглушаны смех, і зноў галовы схіляюцца над канспектамі. Вывучыць не вывучыш, аднак гэта лепш, чым чакаць сваёй чаргі ў нервовым напружанні.

— Што, хвалюецеся? — чуецца ласкавы голас Аляксандры Кузьмінічны Яфрэмкінай, якая на хвілінку выйшла ў калідор.

— Усё будзе добра. Сёння адказваюць лепш, чым учора, матэрыял ведаюць больш глыбока.

— Было болей часу на падрыхтоўку.

— Калі так, то наступная



група будзе адказваць на адны пяцёркі!

За час гэтай гутаркі, атрымаўшы «выдатна», выйшаў С. Уштвант.

— Якія пытанні папаліся?

— Добрыя. Увогуле, усе білеты добрыя, калі іх ведаеш.

— Жартаўнік!

Экзамен працягваецца.

Галіна Іосіфаўна Зубкевіч, кандыдат біялагічных навук, пытае спакойна, разважна. Глыбіня ведаў праяўляецца шэрагам пытанняў па тэме, асабліва з тэарэтычнага боку.

Вось нешта не ладзіцца ў адказе Л. Барысенкі. Цяжка сказаць, што тут, — адсутнасць пэўных ведаў ці ўмення сабрацца з думкамі, засяродзіцца.

— Кім вы працуеце? Чаму выбралі біяфак?

Галіна Іосіфаўна задала пытанне і задумалася. Сама яна заўсёды любіла расліны, без развагі выбрала батаніку і тут, ва універсітэце. Адзінаццаць гадоў працуе ў БДУ, не расчаравалася...

А дзяўчына маўчыць. Не змагла яна адказаць і на астатнія пытанні па курсу. Маўчанне, вядома, золата, але не на экзамене. Прыйдзецца прыйсці ў другі раз.

— Чаму яна адказвала горш за іншых?—разважае выкладчык. — Здаецца, і летняя практыка, і лабараторныя заняткі вяліся добра.

Практыка, якая праходзіла ў рабят на першым і другім курсах, дапамагала засвоіць вучэбны матэрыял, лекцыйны курс. Яна праходзіла на біястанцыі, што на возеры Нарач. Студэнты і цяпер успамінаюць маляўнічыя краявіды, поўныя ўражанняў дні. Тут яны вывучалі сістэматыку раслін, рабілі гербарый, замалёўкі будовы кветак. Характэрныя асаблівасці важнейшых груп раслін былі замацаваны на лабараторных занятках ва універсітэце з дапамогай лупы і мікраскопа.

— Ведаеце, што я цаню ў завочніку, — гаворыць А. К. Яфрэмкіна, якая вяла практыку і лабараторныя,—дык гэта працавітасць, удумлівасць, імкненне ўсё схапіць, засвоіць... Зразумела, завочнікі — людзі больш сталыя, сур'ёзныя, яны маюць жыццёвую загартоўку, як ніхто іншы, ведаюць цану вучобе.

Сапраўды, што кіруе знаёмымі нам А. Карніловіч, Т. Місюкевіч, С. Уштвантам? Матэрыяльнага стымулу быццам няма, а маральны які — самому на душы хораша і перад сябрамі не сорамна. Але ж гэта не галоўнае. Добрая адзнака — паказчык якасці будучага спецыяліста. І вось таму, што завочнікі ў асноўным людзі з багатым жыццёвым вопытам, так значна развіта ў іх усведамленне важнасці вучэбнага працэсу.

...Над універсітэтам нябачна апускаецца вечар.

— Як ідзе класіфікацыя?

— Род, від, сям'я, парадак, клас, аддзел...

Аўдыторыя пусцее. Апошні адказ, апошняя залікоўка. Над сталом схіліліся два экзаменатары:

— Якія ў нас сёння вынікі?

— Каля 70 працэнтаў — «пяцёркі» і «чацвёркі».

— Самымі цяжкімі пытаннямі, аказваецца, для іх былі—паходжанне груп...

— ... і, як ні дзіўна, размнажэнне голанасенных.

— А я, Аляксандра Кузьмінічна, усё ж лічу галоўным пры адказе веданне тэорыі. Колькасць у кветцы пялёсткаў, тычынак забудзецца, а калі ведаць асноўныя напрамкі, сістэматыку, то гэта дапаможа і ў далейшым.

— Так. А я з гэтымі хлопцамі і дзяўчатамі яшчэ сустрэнуся на пятым курсе. Будзем вывучаць расліназнаўства.

Яны ідуць па гулкаму ад дішыні калідору, мяркуюць, прыгадваюць адказы, раяцца аб наступным экзамене. Заўтра ў аўдыторыях зноў будзе гучаць:

— Калі ласка. Я вас слухаю...

**С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**



**Практычныя заняткі па фізіялогіі чалавека і жывёл вядзе ў чацвёртакурснікаў біялагічнага аддзялення завочнага факультэта асістэнт кафедры Эдуард Уладзіслававіч Франкоўскі. Тэма заняткаў—«Рэгуляцыя сардэчнай дзейнасці».**
**Фота Д. ЧАХОВІЧА.**

# ЧАКАЕ ПРАЦОЎНАЕ

ПРАЦОЎНЫ семестр, прысвечаны 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна і 30-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, будзе праходзіць пад лозунгам «Пяцідзесяцігоддзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна—50 ударных дзён».

Да працоўнага семестра гэтага года гатовы 59 студэнцкіх будаўнічых атрадаў БДУ, у якіх будуць працаваць 1890 чалавек. Старанна падабраны штабам працоўных спраў і зацверджаны на бюро камітэта камсамола і ў парткоме кандыдатуры камандзіраў і камісараў СБА. Сярод іх — 19 членаў і кандыдатаў у члены КПСС, 14 — выкладчыкі, супрацоўнікі універсітэта, камсамольскія работнікі.

Згодна з палажэннем аб сацыялістычным спаборніцтве СБА былі прыняты сацыялістычныя абавязацельствы ўсімі атрадамі універсітэта. Многія з іх заключылі дагаворы аб міжатрадным сацыялістычным спаборніцтве ў час падрыхтоўчага і працоўнага перыядаў. А такія атрады, як «Іскра» (гістфак), «Верасок» (філфак) і іншыя, змагаюцца за прысваенне ім імён герояў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Уся ваенна-патрыятычная работа СБА прысвечана 30-годдзю вызвалення Беларусі. Найлепшых дасягненняў тут дабіліся атрады гістарычнага і філалагічнага факультэтаў. Асабліва цікавая работа праведзена СБА імя Ленінскага камсамола гістарычнага факультэта (камандзір У. Карагін).

Шырока разгарнулася сярод байцоў СБА кампанія «Камсамол — сельскай школе». Кожны атрад перадасць сваёй падшэфнай школе кнігі, бібліятэчкі, альбомы.

Ва ўсіх атрадах створаны камсамольскія арганізацыі, выбраны камсоргі, актыў. 265 лектараў будуць удзельнікамі працоўнага семестра. Разам з таварыствам «Веды» штаб працоўных спраў падабраў для іх прыблізную тэматыку лекцый.

Ва універсітэце створаны 53 атрадныя агітбрыгады. Сярод іх быў праведзен конкурс і вызначаны лепшыя агітбрыгады на факультэтах:

гістфак — агітбрыгада атрада «Іскра»;

філфак — «Верасок»,



# ШЛЯХІ ДА ФІЛАСОФІІ

У групе нас 24 чалавекі. У кожнага свой характар, у кожнага сваё жыццё. Хіба аб усім раскажаш? Сустракаемся мы двойчы ў год — у час сесіі. Першае пытанне: «Ну, як жывеш?». І адразу ж размова пераходзіць на падрыхтоўку да залікаў, экзаменаў...

Месяц напружанай працы, і зноў раз'ехаліся. Кожны вярнуўся да сваёй работы.

Усе вельмі розныя: рабочыя і ваеннаслужачыя, настаўнікі, інжынеры і тэхнікі, інструктар гаркома партыі, выхавацельніца дзіцячага сада, дырэктар кінатэатра... Аб'ядноўвае нас не толькі тое, што мы студэнты аднаго курса і ў адны і тыя ж дні здаем залікі, экзамены, перажываем адзін за аднаго, але перш за ўсё прага ведаў, якая прывяла ва універсітэт, і любоў да філасофіі.

Успамінаецца цяпер першы экзамен нашай першай студэнцкай сесіі па курсу «Уводзіны ў філасофію». Перад многімі тады асабліва востра стала пытанне: што мяне прывяло да філасофіі? Кожны да гэтага часу меў пэўную спецыяльнасць, займаўся грамадскай работай. Але аднаму хацелася глыбей пазнаць законы развіцця прыроды і грамадства, другі проста імкнуўся да ведаў, трэці меў схільнасці да роздуму і аналізу фактаў, падзей. Але галоўнае, напэўна, тое, што кожны з нас так ці інакш адчуў патрэбу ахапіць, зразумець увесь ход грамадскага развіцця.

Асноўны ўзрост студэнтаў нашай групы — 28—30 год. Але ёсць людзі і намнога старэйшыя. Віктар Сяргеевіч Талстагузаў перш чым паступіць ва універсітэт, прайшоў складаны шлях ад веры ў незвычайныя сілы, у бога праз асэнсаванне фактаў жыцця да цвёрдага, прынцыповага атэізму. Ён зараз вядзе вялікую грамадскую работу, часта выступае з лекцыямі.

Многа ў нас у групе цікавых, сур'ёзных студэнтаў. Пяць гадоў вучыцца толькі на «добра» і «выдатна» Аляксей Падзярэй. Паспяхова авалодваюць ведамі Віктар Каржыцкі, Валерый Цуранаў. Гэты пералік можна прадоўжыць.

У цяперашнюю сесію мы здалі ўжо тры экзамены і на ўсю групу атрымалі пакуль толькі адну «тройку». Думаю, што апошнія экзамен і залікі здадзім не горш.

Да канца вучобы нам засталося зусім нямнога — усяго год. Магчыма, не ўсе потым напасрэдна будуць звязаны з філасофіяй. Але з упэўненасцю можна сказаць, што веданне яе будзе дапамагаць кожнаму з нас у паўсядзённай рабоце і грамадскай дзейнасці.

**У. КАРАГІН,**
**стараста V курса аддзялення філасофіі завочнага факультэта.**

# ЗНАЁМСТВЫ, ЗНАЁМСТВЫ...

У тым, што летняя сесія зусім не падобна на зімовую, мы пераканаліся адразу: больш працяглая па часу і больш насычаная. У 30 сесійных дзён 4 залікі, 4 экзамены ды яшчэ новы прадмет — тэорыя і практыка савецкай журналістыкі. Чакалі мы і знаёмства з прафесарам Абецэдарскім.

Пра Л. С. Абецэдарскага мы шмат чулі. Адны гавораць: «З першага разу не здасі», іншыя: «Справядлівы чалавек». І вось першая яго лекцыя. Цішыня. Зайшоў выкладчык і адразу ўдакладніў: «Не ўтаю, некаторыя здаюць мне не адзін раз. Але калі я ўжо пастаўлю залік, дык лічыце, што мой прадмет вы будзеце ведаць добра».

А затым мы паглыбіліся ў гісторыю роднага краю, ды так, што і званка не чулі.

А сесія ідзе сваім шляхам. Мы ўсё яшчэ мала знаёмы паміж сабой. Першы курс, завочнікі. Ідзе «тэрытарыяльнае» знаёмства.

— Ты адкуль?

— З Брэсцкай вобласці.

— А я з Баранавіч, землякі!

У кожнага пакуль свае інтарэсы. Ужо выявіліся выдатнікі і адстаючыя, зубрылы і ныцікі. Ведаем, хто здаў і хто не здаў, у каго «аўтамат», у каго «хвост».

Але галоўнае ў нас яшчэ наперадзе. І, як сказаў адзін з выкладчыкаў, «галоўны залік вам паставіць практыка».

**Тэкст і фота студэнта І курса аддзялення журналістыкі**
**Э. ЭЛЬКСІНА.**



● Калі ў цябе ёсць жаданне глыбока вывучыць прадмет, заўсёды паявяцца пытанні. Старшы выкладчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання А. А. Рудэнка заўсёды гатова дапамагчы ў іх вырашэнні.

● Займаюцца завочнікі.

# ЗАЎСЁДЫ Ў ПАЛЁЦЕ

Пасажыры з палёгкай уздыхнулі. Самалёт павольна пакаціўся па лётным полі, у шкло білі струмені свежага паветра.

Камандзір карабля Уладзімір Станіслававіч Багдановіч выцер з ілба пот. Толькі цяпер, калі ўсё было ззаду, прыйшло ўсведамленне вялікай важнасці таго, што зрабіў іх экіпаж.

Палёт карабля «ТУ-124», які павінен быў даставіць пасажыраў з Мінска ў Сухумі, пачаўся звычайна. Нечакана ў паветры выявілася, што перастала дзейнічаць левая стойка шасі. Якая была першая думка камандзіра, што ён адчуў у тую хвіліну?

— Не памятаю, —прызнаўся потым Уладзімір Станіслававіч. —Адразу ж, імгненна, увесь напружыўся, сабраўся, мозг стаў працаваць з матэматычнай дакладнасцю. Нельга было дапусціць разгубленасці экіпажа, праявіць нядбайнасць.

Спакойна, вытрымана дзейнічалі камандзір і яго памочнікі; звязаліся з «Зямлёй», разам выпрацавалі рашэнне. Адзін за адным рабіў самалёт кругі над аэрадромам, дзе замерлі пажарныя і санітарныя машыны.

— Садзімся!

Амаль над самай зямлёй раскрыўся тармазны парашут самалёта. Невялікі крэн, але машына не падае, коціцца... Перамога!

Гэта было паўмесяца назад. Цяпер Уладзімір Станіслававіч здае сесію. Ён студэнт філасофскага аддзялення завочнага факультэта. Працаваць, канешне, больш цяжка, чым вучыцца. Але, на яго думку, вучоба заўсёды дапамагае ў рабоце, садзейнічае, спадарожнічае поспеху.

— Чаму я, лётчык, выбраў філасофію?

Бачыце, яна вельмі дакладна вызначае этапы, асаблівасці грамадства. Гуманітарныя навукі даюць магчымасць правільна мысліць. А правільнае мысленне дапамагае выйсці пераможцай з любога складанага становішча, выпрацаваць дзейснае рашэнне.

Што гэта так, мы ўжо пераканаліся.

У. С. Багдановіча ў Мінскі аэраклуб прывяла, пэўна, рамантыка нябесных прастораў. Але ўжо праз год неба прыцягнула глыбей. У выніку — вучоба ў лётным вучылішчы. Потым два гады цяжкай, складанай працы на Поўначы. Мабыць, тут ен атрымаў канчатковую загартоўку. Прага ж да ведаў, імкненне да самаўдасканалення прывялі ў Школу вышэйшай лётнай падрыхтоўкі ва Ульянаўску. Цяпер — універсітэт.

У гэтыя дні Уладзімір Станіслававіч Багдановіч рыхтуецца да здачы наступнага экзамена — гісторыі філасофіі. Як перад складаным палётам, тыя ж у яго сабранасць і засяроджанасць.

**У. УСЦІНОВІЧ.**

# З КОЖНЫМ СТУДЭНЦКІМ ДНЁМ...

І для студэнтаў аддзялення журналістыкі завочнага факультэта наступіла самая адказная пара — летняя сесія. Неабходна здаць чатыры экзамены і тры залікі. Не лёгка прыходзіцца, але з кожнай нашай чарговай сустрэчай мы смялей крочым па універсітэцкіх аўдыторыях, смялей заглядваем у метадычны кабінет, бібліятэку, на кафедры.

На месцах сваёй работы — саўгас гэта ці калгас, раённая ці заводская рэдакцыя — мы на працягу вучэбнага года самастойна спасцігаем тэорыю, пацвярджаем яе практычнай дзейнасцю, выступаючы на старонках газет, сваёй асабістай працай уносім уклад у здзяйсненне намечаных рубяжоў. А на экзаменацыйных сесіях мы дэманструем свае тэарэтычныя веды і накопленны вопыт.

Своеасаблівай урачыстасцю з'яўляюцца для нас практычныя заняткі па сучаснай рускай, беларускай мовах, па гісторыі КПСС, па тэорыі і практыцы савецкай журналістыкі і іншых дысцыплінах.

Вельмі цікава праходзілі ў нас практычныя заняткі па гісторыі КПСС, якія вёў Валерый Сцяпанавіч Клімовіч. Думаецца, у кожнага засталася ў памяці размова аб сацыялістычным спаборніцтве. Адзін за другім чуліся адказы на пастаўленыя пытанні. Прычым кожнае з іх разбіралася дэталёва. Асноўны даклад дапаўнялі адказамі з месц. Затым Валерый Сцяпанавіч яшчэ раз звярнуў увагу ўсіх на галоўнае, прыводзячы ўсё сказанае ў стройную сістэму. І яшчэ адна асаблівасць. Валерый Сцяпанавіч стараецца прыцягнуць да размовы кожнага і. асабліва маўклівых.

Важна і тое, што на гэтых занятках мы набываем не толькі веды па гісторыі КПСС, але і з практычнай журналісцкай дзейнасці. Адказваючы за кафедрай, мы вучымся майстэрству выступаць перад аўдыторыяй.

Ад нас патрабуецца не проста завучванне матэрыялу, а глыбокае разуменне, уменне знайсці галоўнае, падмацаваць думку канкрэтнымі прыкладамі з жыцця, з пункту погляду газетчыка прааналізаваць той ці іншы факт, выказаць свае меркаванні.

Усё гэта каштоўна для нас. І хочацца ад імя ўсёй групы сказаць Валерыю Сцяпанавічу вялікае дзякуй.

**С. АФАНАСЬЕВА,**
**студэнтка ІІ курса завочнага факультэта.**

# ЛЕТА

«Буравеснік-74», «Мара»;
юрфак — «Феміда-3»;
ФПМ — «Купалінка»;
фізфак — «Спадчына»;
хімфак — «Урал-74»;
матфак — «Расінка».

Байцы будаўнічых атрадаў не забылі свой кліч — «Кожны баец СБА — значкіст ГПА». На сённяшні дзень 80 працэнтаў будаўнікоў здалі нормы гэтага комплексу.

Вялікую ўвагу ўдзяляе штаб працоўных спраў БДУ стварэнню на месцах дыслакацыі лагераў-спадарожнікаў. Сваім вопытам у рабоце з дзецьмі дзеляцца з іншымі байцы атрадаў «Верасок» і «Спадарожнік».

У гэтым годзе плануем стварыць не менш 30 летніх лагераў для школьнікаў. Акрамя таго, вядзецца работа з «цяжкімі» для выхавання падлеткамі, некаторыя з іх будуць працаваць гэтым летам у складзе нашых будаўнічых атрадаў.

У працоўным семестры прымуць удзел і студэнты з ДРВ, Бенгладэш і іншых краін. Ёсць у нас атрад, які паедзе ў ГДР і будзе працаваць з нашымі нямецкімі сябрамі на будоўлях Патсдама. А група студэнтаў з ГДР правядзе трэці семестр у Беларусі.

Падыходзіць к канцу падрыхтоўчы перыяд. Закончыўся медыцынскі агляд, усе байцы СБА здалі экзамен па тэхніцы бяспекі. Завершана дагаворная кампанія. З камсамольскім актывам, з камандзірамі і камісарамі СБА праведзены семінары, асноўная мэта якіх — дапамагчы атрадам своечасова выявіць і ліквідаваць недахопы і з поўнай гатоўнасцю падысці да працоўнага семестра.

Добра праводзяць падрыхтоўчы перыяд штабы працоўных спраў філалагічнага факультэта (начштаба Р. Саматыя), гістарычнага факультэта (А. Батуш), ФПМ (П. Матус), а вось на фізічным і юрыдычным факультэтах не ўсё ладзіцца. Камітэты камсамола павінны актывізаваць работу па падрыхтоўцы да працоўнага семестра і дапамагчы сваім штабам працоўных спраў. Ні для каго не сакрэт, што ад вынікаў падрыхтоўчага перыяду залежыць поспех работы ў трэцім семестры.

Наладзіліся ў апошні час справы на матэматычным факультэце. Работа начальніка штаба была заслухана на парткоме і на бюро камітэта камсамола.

Што датычыць штаба працоўных спраў БДУ, то састаў яго ў гэтым годзе амаль поўнасцю змяніўся. Гэта выклікала пэўныя цяжкасці. І хоць зроблена шмат, можна было б дабіцца значна большых поспехаў, калі б касцяк штаба быў больш-менш пастаянным.

**С. КУНІЦКІ,**
**камісар штаба працоўных спраў БДУ.**

